УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

Аб’ект аўтарскага права
УДК 94(476)«17/18»:930(043.3)

СЯМАШКА
Надзея Канстанцінаўна

# БЕЛАРУСКІЯ І РАСІЙСКІЯ ДАСЛЕДАВАННІ АГРАРНАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ (КАНЕЦ XVIII ст. – 1850-я гг.)

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

па спецыяльнасці 07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады
гістарычнага даследавання

Мінск, 2024

Работа выканана ва ўстанове адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік – | **Люты Анатолій Міхайлавіч,** доктар гістарычных навук, прафесар |
| Афіцыйныя апаненты: | **Здановіч Уладзімір Васільевіч,** доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі ўстановы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна»;<br><br>**Урублеўскі Юрый Уладзіміравіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры сацыяльнай работы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»; |

Апаніруючая арганізацыя – дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

Абарона адбудзецца 18 снежня 2024 года у 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.21.03 пры ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» па адрасе: 220030, г. Мінск, вул. Савецкая, 18, ауд. 482, тэл.: 311-21-61, e-mail: surma623@gmail.com

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка».

Аўтарэферат разасланы «16» лістапада 2024 года.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый А.А.Сурма

# УВОДЗІНЫ

Актуальнасць тэмы дысертацыйнага даследавання абумоўлена адсутнасцю ў сучаснай айчыннай гістрарычнай навуцы абагульняючай працы па гістрарыяграфіі аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг., што павышае яе тэарэтычную і практычную значнасць. Аграрная гісторыя Беларусі традыцыйна з'яўляецца аб'ектам значнай увагі навукоўцаў. Цікавасць вучоных пры гэтым адрасавана не да ўсёй храналагічнай канвы яе развіцця, а да яе асобных фрагментаў. Гэтыя аспекты ўяўляюцца значнымі, таму што яны, безумоўна, былі вызначальнымі для фарміравання агульнага ўяўлення аб развіцці аграрнага сектара эканомікі.

Канец XVIII ст. – 1850-я гг. уяўляе сабой пераходны перыяд у сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі, больш за 90 % насельніцтва якой на той час складалі сяляне. У гэты час зараджаюцца новыя буржуазныя адносіны, якія прыйшлі на змену старым, феадальна-прыгонніцкім. Праблема аграрных адносін заўсёды з'яўлялася актуальнай, аднак і сёння застаецца ў шэрагу дыскусійных пытанняў і адным з прыярытэтных напрамкаў гістарыяграфіі. Менавіта гістарыяграфічнае асэнсаванне развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі перыяду генезісу капіталізму дазволіць выявіць прабелы і тэарэтычныя скажэнні, выкліканыя суб'ектыўнымі фактарамі. Вывучэнне гістарыяграфіі аграрнай гісторыі дапаможа зразумець спецыфіку даследаванняў ў галіне абра най тэмы.

Аграрная гісторыя – гэта неад'емная частка гісторыі дзяржавы і важны кампанент сучаснасці, які патрабуе аб'ектыўнага аналізу свайго развіцця. Сучасныя рэаліі айчыннай гістарычнай навукі дыктуюць патрэбу ў пошуку аб'ектыўных падыходаў і распрацоўкі новых тэорый і канцэпцый. Таму гістарыяграфічныя даследаванні набываюць усё большую значнасць. Ва ўмовах жорсткай сусветнай канкурэнцыі Рэспубліка Беларусь – экспартаарыентаваная дзяржава з развітой прамысловасцю, сектарам паслуг і сельскай гаспадаркай. У адпаведнасці з далейшым эфектыўным дзяржаўным будаўніцтвам адметнае значэнне павінна надавацца даследаванням аграрнай гісторыі Беларусі, асабліва ў пераходныя эпохі.

Аграрная гісторыя Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг. патрабуе гістарыяграфічнага асэнсавання і распрацоўкі абгрунтаванай гістарыяграфічнай канцэпцыі. У айчыннай навуцы дадзеная праблема распрацавана ўпершыню, і таму яе даследаванне можа стаць асновай для падрыхтоўкі аналагічных гістарыяграфічных пошукаў, якія тычацца іншых перыядаў айчыннай гісторыі. Гістарыяграфія выяўляе «сацыяльны заказ» грамадства на навуковыя веды і ролю гэтых ведаў у вырашэнні праблем сучаснасці. Для распрацоўкі

абгрунтаванай гістарыяграфічнай канцэпцыі неабходна прааналізаваць працы па даследуемай праблеме. Веданне гісторыі сваёй навукі з’яўляецца неабходнай састаўной часткай, паказчыкам ступені прафесійнай падрыхтоўкі гісторыка і прывучае беражліва адносіцца да ўсяго, што зроблена на шляху пазнання мінулага, выхоўвае павагу да папярэдніх пакаленняў гісторыкаў і сваіх сучаснікаў. У дысертацыі праанлізаваны толькі тыя працы расійскіх гісторыкаў, якія непасрэдна прысвечаны вывучэнню аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь работы з навуковымі праграмамі (праектамі), тэмамі

Дысертацыйнае даследаванне выканана ў рамках рэалізацыі дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2011–2015 гг. «Гісторыя, культура, гармадства, дзяржава» па тэме «Сацыяльна-эканамічныя, этна-нацыянальныя, культурна-канфесійныя і палітычныя працэсы ў Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. і іх уплыў на фаріраванне беларускай нацыі», нумар дзяржрэгістрацыі – 20111202, а таксама ў межах выканання НДР «Современная историография аграрной истории Беларуси конца XVIII – первой половины XIX в.» (нумар дзяржрэгістрацыі – 20130414).

### Мэта і задачы даследавання

**Мэтай** дысертацыйнага даследавання з’яўляецца выяўленне ўласцівых расійскай, савецкай гістарыяграфіі, навейшым даследаванням у Рэспубліцы Беларусь і Расійскай Федэрацыі метадаў, падыходаў, тэндэнцый, агульнага і асаблівага для распрацоўкі гістарыяграфічнай канцэпцыі аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг.

Мэта работы абумовіла пастаноўку і вырашэнне наступных даследчых *задач*:

- абгрунтаваць перыядызацыю гістарыяграфіі аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг. на падставе сучасных метадалагічных падыходаў;
- вызначыць уклад навукоўцаў Расійскай імперыі ў распрацоўку праблем аграрнай гісторыі Беларусі;
- раскрыць прыярытэтныя напрамкі гістарычных даследаванняў савецкага перыяду аграрнай гісторыі Беларусі азначанага часу;
- выявіць тэндэнцыі вывучэння і асаблівасці метадалагічных падыходаў, уласцівых навуковым працам гісторыкаў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі ў працэсе даследавання аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг.

**Аб’ектам** даследавання з’яўляецца аграрная гісторыя Беларусі ў асвятленні айчыннай і расійскай гістарыяграфіі.

**Прадметам** даследавання выступае беларуская і расійская гістарыяграфія аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг.

**Храналагічныя рамкі** дысертацыйнага даследавання ахопліваюць перыяд другой паловы XIX – пачатак XXI ст. Дата ніжняй мяжы звязана з пачаткам першых навуковых даследаванняў аграрнай гісторыі Беларусі. Верхняя мяжа дысертацыйнага даследавання вызначаецца сучасным станам гістарычнай навукі ў галіне вывучэння аграрнай гісторыі Беларусі.

**Навуковая навізна**

Упершыню ў беларускай гістарычнай навуцы выяўлены канцэптуальныя падыходы, тэндэнцыі і асаблівасці ў вывучэнні аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг., уласцівыя гістарыяграфіі Расійскай імперыі і савецкага перыяду, навуковым публікацыям у Рэспубліцы Беларусь і Расійскай Федэрацыі, што дазволіла сфармуляваць канцэпцыю даследавання, выявіць праблемы, якія патрабуюць далейшай навуковай распрацоўкі.

Навуковая навізна дысертацыйнай работы заключаецца і ў тым, што ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі праведзены аналіз публікацый даследчыкаў дарэвалюцыйнага перыяду, устаноўлены іх этнаграфічная накіраванасць, апісальнасць падзей і працэсаў пры мінімальнай колькасці выкарыстанных дакументальных крыніц. Выяўлены асноўныя напрамкі і прыярытэты ў даследаваннях савецкага часу пры абсалютызацыі марксісцка-ленінскай метадалогіі з мэтай абгрунтавання непазбежнасці крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы і заканамернага скасавання прыгоннага ладу. Устаноўлена, што на падставе ўвядзення ў навуковы ўжытак разнастайнага кола дакументальных крыніц зараджэнне элементаў капіталізму характарызавалася савецкімі гісторыкамі як комплексная праблема, якая ўключала ў адзінае цэлае сацыяльна-эканамічныя, класавыя і палітычныя аспекты. У дысертацыі ўпершыню ў гістарычнай навуцы ў праблемна-храналагічным плане праведзены аналіз сучаснага стану айчыннай гістарыяграфіі аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг. Нягледзячы на дэідэалагізацыю гістарычнай навукі пасля распаду СССР, гісторыкі сучаснага перыяду ў недастатковай ступені пераасэнсоўваюць атрыманыя вынікі даследаванняў савецкага часу. Разам з тым, тэарэтычны плюралізм дазволіў навукоўцам вывучаць гістарычны працэс з пункту гледжання розных метадалагічных падыходаў, адмовіўшыся ад старых дагматаў – партыйнасці і класавага падыходу. У сучаснай гістарыяграфіі на падставе рэалізацыі мадэрнісцкай тэорыі гісторыкі прайшлі да высновы аб перабольшванні тэмпаў развіцця генезісу капіталізму ў беларускай вёсцы, ролі

класавай барацьбы як вызначальнага фактару пераходу ад феадалізму да буржуазнага грамадства. Аб'ектам даследаванняў становяцца саслоўныя групы насельніцтва (дваранства, шляхта, сяляне, святары, а таксама і іншыя сацыяльныя групы, не ўласцівыя рускім губерням). Пры гэтым актыўна выкарыстоўваюцца не толькі традыцыйныя, але і метады мікрагісторыі, гісторыі паўсядзённасці, антрапалагічнай і гендэрнай гісторыі, што дазваляе больш поўна і аб'ектыўна ацаніць уклад сучасных даследчыкаў у распрацоўку праблем аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг. Прапанавана перыядызацыя гістарыяграфіі аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850- х гг. Пры гэтым акрэслены праблемы, якія патрабуюць паглыбленага і ўсебаковага вывучэння аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст.

**Палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону**

1. У развіцці гістарыяграфіі аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг. неабходна вылучыць тры асноўныя перыяды:

1) гістарыяграфія Расійскай імперыі (другая палова XIX ст. – 1917 г.), які характарызаваўся з'яўленнем першых прац па аграрнай гісторыі Беларусі даследуемага часу, выкарыстаннем прынцыпаў прагматызму і гістарызму, уплывам «дзяржаўнай школы» і тэорыі «гандлевага капіталу» на змест даследаванняў;

2) гістарыяграфія савецкага перыяду (1917–1991 гг.). Вядучай тэндэнцыяй гэтага часу стаў уплыў класавага падыходу і метадалагічнага манізму на характар навуковых даследаванняў, што прывяло да перабольшвання тэмпаў генезісу капіталізму ў сельскай гаспадарцы, а таксама пераносу агульнарасійскіх ацэнак рзавіцця элементаў капіталізму на беларускі рэгіён. У гэтым перыядзе неабходна вылучыць наступныя этапы: а) 1920-я гг. – ідэйная барацьба паміж гісторыкамі-марксістамі і прадстаўнікамі дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі. Панаванне канцэпцыі «гандлёвага капіталу»; б) 30-я – сярэдзіна 50-х гг. XX ст. – станаўленне і развіццё марксісцка-ленінскай канцэпцыі гістарычнага працэсу ў спалучэнні з рэпрэсіўнай палітыкай Савецкай дзяржавы ў дачыненні да апанентаў; в) сярэдзіна 50-х – сярэдзіна 60-х гг. – імкненне гісторыкаў па-новаму «перачытаць» К.Маркса, адыход ад сталінскага вульгарызму; г) сярэдзіна 60- х – сряэдзіна 80-х гг. – кансерватызм у даследаваннях з прыцягненнем разнастайнага кола інфармацыі дакументальных крыніц; д) сярэдзіна 80-х – 1991 г. – першыя спробы пераасэнсавання гістарычнага мінулага з улікам новых метадалагічных падыходаў;

3) гістарычныя даследаванні ў Рэспубліцы Беларусь і Расійскай Федэрацыі пачалі фарміравацца з 1992 г. Для іх характэрна вывучэнне аграрнай гісторыі Беларусі, зыходзячы з сучасных метадалагічных падыходаў.

2. Першыя спробы аналізу гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг. адносяцца да другой паловы XIX ст. У гэты перыяд даследаванні насілі пераважна этнаграфічны характар: выкарыстоўваўся апісальны метад, высновы рабіліся без апоры на крыніцы (М.В. Без-Карніловіч). Пры гэтым аб’ектам даследавання з’яўлялася галоўным чынам палітычная гісторыя і наўмысна змяншалася роля і месца сацыяльна-эканамічнага фактару ў жыцці грамадства. Усё гэта прыводзіла да суб’ектыўных і неабгрунтаваных высноў наконт самабытнасці Беларусі (М.В. Каяловіч, В.В. Ключэўскі, П.Д. Бранцаў, М.К. Любаўскі, М.Ф. Уладзімірскі-Буданаў і інш.). Для работ канца XIX – пачатку XX ст. былі ўласцівы суб’ектыўныя высновы гісторыкаў пад уплывам тэорыі «гандлёвага капіталу», клерыкальнай метадалогіі аб істотнай ролі Рускай Праваслаўнай Царквы ў сацыяльна-эканамічным развіцці беларускай вёскі (П. Шчабальскі).

3. У межах савецкага перыяду вывучэнне аграрнай гісторыі Беларусі даследуемага часу прыпадае на 1917– 1991 гг. Для 1920-х гг. характэрна ідэйная барацьба паміж гісторыкамі-марксістамі і прадстаўнікамі дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі, уплыў канцэпцыі «гандлёвага капіталу» на змест навуковых даследаванняў. З 1930-х гг. пашыраецца праблематыка навуковых даследаванняў (В.К. Шчарбакоў, Д.А. Дудкоў, К.І. Кернажыцкі і інш.) на падставе марксіцка-ленінскай метадалогіі: разлажэнне феадальна-прыгонніцкай сістэмы, развіццё таварна-грашовых адносін, эвалюцыя феадальнай рэнты і г. д. Працы сярэдзіны 50-х – сярэдзіны 80-х гг. XX ст. насілі дыскусійны характар аб тэмпах генезісу капіталізму ў аграрным сектары эканомікі Беларусі. Пры гэтым выкарыстоўвалася больш шырокае кола крыніц, пабачылі свет значныя манаграфічныя публікацыі. Разам з тым кіраванне толькі адзінай марксісцка-ленінскай метадалогіяй скажала аб’ектыўнасць вынікаў даследаванняў. Сацыяльна-эканамічныя працэсы, характэрныя для рускіх губерняў, механічна пераносіліся на Беларусь. Для гісторыкаў было ўласціва атаясамліванне працэсаў разлажэння феадальна-прыгонніцкіх і зараджэння новых, буржуазных адносін. Пры гэтым генезіс капіталізму характарызаваўся як комплексная праблема, што звязвала ў адзінае цэлае сацыяльна-эканамічныя, класавыя і палітычныя аспекты.

4. Гістарыяграфія ў Рэспубліцы Беларусь і Расійскай Федэрацыі характырызуецца комплексным падыходам да даследавання праблем, выкарыстаннем значнай колькасці крыніц, пераасэнсаваннем атрыманых

вынікаў савецкага перыяду на аснове новых матадалагічных падыходаў. Грунтоўна даследаваны пытанні сялянскага землеўладання і землекарыстання ў Беларусі ў XVI–XVIII ст., катэгорыі сялян, праблемы сялянскай абшчыны ў дзяржаўных, прыватнаўласніцкіх і царкоўных уладаннях Беларусі ў XVI–XVIII стст. (В.Ф. Голубеў). Праблематыка фарміравання саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. найбольш цэласна адлюстравана у публікацыях У.А. Сосны. Асноўнай абагульняючай працай па аграрнай гісторыі з'явілася «Гісторыя сялянства Беларусі» (Мінск, 1997 г.), у якой грунтоўна прааналізаваны сацыяльна-эканамічныя працэсы ў беларускай вёсцы. Знакавай абагульняючай працай па сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі з'яўляецца акадэмічные выданне «Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.)» (2020 г.). Разам за тым, нягледзячы на шырокі дыяпазон праблематыкі даследаванняў, застаюцца малавысветленымі пытанні развіцця таварна-грашовых адносін на этапе крызісу феадалізму; месца абмену і фінансаў у працэсе генезісу капіталізму; шляхі эвалюцыі разнастайстайных форм пазямельнай рэнты; характар эканамічных узаемаадносін паміж горадам і вёскай. Дыскусійнымі застаюцца пытанні ўзроўню маёмаснай і сацыяльнай дыферэнцыяцыі сялянства; характар прамысловага прадпрымальніцтыва памешчыкаў і яго ўплыў на сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускай вёскі; роля і месца латыфундыяльнага землеўладання ў мадэрнізацыі эканомікі края і інш.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені ў выніку дысертацыі з аддзяленнем іх ад суаўтараў сумесных даследаванняў і публікацый**

Дысертацыйнае даследаванне з'яўляецца самастойна выкананай працай. Саіскальнікам узнята важная навуковая праблема айчыннай гістарыяграфіі і прапанаваны падыход да яе вырашэння, які прадугледжвае аб'ектыўнае даследаванне існуючых уяўленняў на аснове гістарыяграфічнай рэфлексіі. Для дасягнення мэты даследавання аўтар дысертацыі разглядае канструяванне адзінай гістарыяграфічнай канцэпцыі для вывучэння праблемы аграрнай гісторыі Беларусі перыяду распаду феадальных і зараджэння новых буржуазных адносін. Упершыню ў айчыннай гістарычнай навуцы саіскальнікам выяўлены ўласцівыя расійскай і савецкай гістарыяграфіі, навейшым даследаванням у Рэспубліцы Беларусь і Расійскай Федэрацыі метады, падыходы, тэндэнцыі, агульнае і асаблівае пры вывучэнні праблем крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы і генезісу капіталізму ў аграрным сектары эканомікі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Вынікі дысертацыйнага даследавання дакладваліся і абмяркоўваліся на пасяджэнні кафедры гісторыі Беларусі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка». Асноўныя палажэнні дысертацыі атрымалі адлюстраванне ў дакладах аўтара на навуковых канферэнцыях: «Европа: актуальные проблемы этнокультуры» (Мінск, 22 красавіка 2013 г.), «Европа: актуальные проблемы этнокультуры» (Мінск, 21 студзеня 2014 г.), «Подзвігу народа жыць у вяках (да 70-годдзя Вялікай Перамогі)» (Мінск, 28 красавіка 2015 г.), «Социально-экономическая история Советской Беларуси (1917–1991 гг.)» (Минск, 26–27 октября 2023 г.). Вынікі дысертацыйнага даследавання ўкаранены ў адукацыйны працэс БДПУ. Акт аб укараненні прыкладаецца.

**Апублікаванасць вынікаў даследавання**

Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі адлюстраваны ў 6 навуковых артыкулах у выданнях, якія ўключаны ВАК Рэспублікі Беларусь у пералік навуковых выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў (2,3 аўт. л.), 7 публікацый – у навуковых зборніках (1,5 аўт. л.), 3 – у зборніках матэрыялаў канферэнцый (0,6 аўт. л.)

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Дысертацыйнае даследаванне складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу і дадаткаў. Агульны аб’ём дысертацыі складае 148 старонак. Асноўны тэкст дысертацыі – 116 старонак, бібліяграфічны спіс займае 30 старонак і ўключае 308 найменняў і 16 найменняў аўтарскіх публікацый.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

**У першай главе «Гістарыяграфічныя даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.). Метадалогія і канцэпцыя даследавання»** праанализаваны працы па гістарыяграфіі аграрнай гісторыі Беларусі акрэсленага часу. Гістарыяграфія аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг.ўяўляе сабой сукупнасць прац, якія можна сістэматызаваць і падзяліць на асобныя перыяды. Упершыню праблему перыядызацыі

гістарыяграфіі Беларусі ўзняў А.П. П’янкоў[1] і яе пачатак звязваў з 1921 г. – адкрыццём Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, што паспрыяла правядзенню фундаментальных даследаванняў[2] айчыннымі гісторыкамі, з чым можна пагадзіцца. Гэтай жа пазіцыі прытрымліваўся гісторык А.П. Ігнаценка [3].

Наступны перыяд у вывучэнні аграрнай гісторыі Беларусі можна аднесці да 30-х – сярэдзіны 50-х гг. ХХ ст. У гэты час усталявалася і зацвердзілася марксісцка-ленінская метадалогія, а таксама былі вызначаны галоўныя напрамкі гістарычных даследаванняў[4]. Характэрнай рысай гатага перыяду развіцця гістарыяграфіі была схільнасць да эканамічных праблем, пры гэтым недастаткова даследавалія сацыяльна-прававыя аспекты генезісу капіталізму. Трэці перыяд ахоплівае прамежак часу з сярэдзіны 50-х – да сярэдзіны 80-х гг. ХХ ст. і характарызуецца накапленнем гісторыкамі факталагічных ведаў[5], выданнем першых абагульняючых прац па аграрнай гісторыі Беларусі. Уступныя раздзелы і дысертацыйных даследаванняў[6] манаграфій[7] былі прысвечаны

---

[1] Пьянков, А. П. Основные этапы в развитии белорусской историографии за 30 лет / А. П. Пьянков // Наука в БССР за 30 лет : сб., посвящ. 30-летию БССР / Акад. наук БССР ; под общ. ред. Н. И. Гращенкова. – Минск, 1949. – С. 456–471.

[2] Пичета, В. И. Введение в Русскую историю: источники и историография / В. И. Пичета. – М. : Госиздат, 1922 – 205 с.

[3] Игнатенко, А. П. Введение в историю БССР: периодизация, источники, историография / А. П. Игнатенко. – Минск : Высш. шк., 1965. – 48 с.

[4] Шчарбакоў, В. К. Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі = The class-struggle and historical science in White-Russia / В. К. Шчарбакоў ; адк. рэд. С. Матулайціс. – Мінск : Выд-ва Беларус. акад. навук, 1934. – 104 с.

[5] Похилевич, Д. Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы в XVI–XVIII вв. / Д. Л. Похилевич. – Львов : Изд-во Львов. ун-та, 1957. – 174 с.

[6] Чепко, В. В. Разложение феодально-крепостнической системы и формирование капиталистических отношений в сельском хозяйстве Белоруссии в первой половине XIX века : автореф. дис. ... д-ра ист. наук : 07.00.02 / В. В. Чепко ; Акад. наук БССР, Ин-т истории. – Минск, 1968. – 56 с.

[7] Мелешко, В. И. Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии (вторая половина XVII–XVIII в.) / В. И. Мелешко. – Минск : Наука и техника, 1975. – 246 с.

пытанням гістарыяграфіі сельскай гаспадаркі Беларусі[8]. Пашыралася архіўная база, павышаўся тэартычны ўзровень даследавання аграрнай праблематыкі.

Перыяд з другой паловы 80-х гг. – да 1991 г. – прадстаўлены навуковымі артыкуламі і абагульняючымі працамі па гістарыяграфіі[9]. Асобна трэба адзначыць манаграфію Э.Р. Іофе «Из истории белорусской деревни (Советская историография социально-экономического развития белорусской деревни середины XVII – первой половины XIX в.)»[10]. Гэты перыяд характарызваўся працягам даследаванняў у русле марксісцка-ленінскай тэорыі развіцця гістарычнага працэсу і з’яўленнем першых спроб больш крытычнага падыходу ў даследаваннях гісторыі Беларусі. У 90-я гг. XX – пачатку XXI ст. выходзяць дапаможнікі[11] па гістарыяграфіі[12] і манаграфіі, прысвечаныя сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі перыяду феадалізму[13]. Апошні перыяд, характарызуецца зваротам даследчыкаў да праблем гістарыяграфіі наогул[14] і канкрэтна гістарыяграфіі аграрнай гісторыі[15], уздымаюцца праблемы

---

[8] Козловский, П. Г. Землевладение и землепользование в Белоруссии в XVIII – первой половине XIX в. / П. Г. Козловский ; ред. Н. Н. Улащик. – Минск : Наука и техника, 1982. – 204 с.

[9] Копысский, З. Ю. Историография БССР. Эпоха феодализма : учеб. пособие / З. Ю. Копысский, В. В. Чепко ; науч. ред. Я. Н. Мараш. – Минск : Университетское, 1986. – 175 с.

[10] Иоффе, Э. Г. Из истории белорусской деревни (советская историография социально-экономического развития белорусской деревни середины XVII – первой половины XIX в.) / Э. Г. Иоффе – Минск : Ураджай, 1990. – 248 с.

[11] Касовіч, В. Ф. Гістарыяграфія і крыніцы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX ст. / В. Ф. Касовіч. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 1996. – 93 с.

[12] Белазаровіч, В. А. Гістарыяграфія гісторыі Беларусі : дапаможнік / В. А. Белазаровіч. – Гродна : Гродзен. дзярж. ун-т, 2006. – 345 с.

[13] Люты, А. М. Сацыяльна-эканамічнае развіцце Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX стагоддзя / А. М. Люты. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2004. – 320 с.

[14] Астрога, В. Беларуская гістарыяграфія найноўшага часу: преблемы перыядызацыі / В. Астрога // Гістарычны альманах / Беларус. гіст. т-ва. – Гародня, 2002. – Т. 7 : Матэрыялы II навуковай канферэнцыі Беларускага гістарычнага таварыства “Праблемы перыядызацыі гісторыі Беларусі”, Магілёў, 23–25 лістап. 2001 г. – С. 11–19.

[15] Панютич, В. П. Историография аграрной истории Беларуси 1861–1917 гг. / В. П. Панютич // Проблемы методологии исследований истории Беларуси : материалы Междунар. науч. конф.,

перыядызацыі гістарыяграфіі гісторыі Беларусі на навуковых канферэнцыях[16 17]. Грунтоўнай з'яўляецца праца, выкананая Інстытутам гісторыі НАН Беларусі, якая была выдадзена ў 2020 г. «Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.)[18].

У беларускай гістарычнай навуцы сфарміраваліся навуковыя цэнтры гістарыяграфічных даследаванняў на базе Інстытута гісторыі НАН Беларусі, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка і Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Праблемнае поле даследаванняў беларускай гістарыяграфіі 90- х гг. XX ст. пачатку – XXI ст. аналізаваў Д.В. Караў[19].

**Метадалагічную аснову** даследавання склала сукупнасць прынцыпаў (гістарызму, аб'ектыўнасці і каштоўнаснага падыходу), агульнанавуковыя (аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя, узыходжанне ад канкрэтнага да абстрактанага) і канкрэтна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны) метады, што дазволіла вырашыць пастаўленыя задачы.

**Канцэптуальная ідэя дысертацыйнага даследавання** заключаецца ў тым, што праблема аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг. дасканала не вырашана і ёй не надаецца дастатковай увагі ў гістарычнай навуцы. Вызначаны перыяд выпадае амаль з усіх абагульняючых прац па гістарыяграфіі ў якасці самастойнага перыду аграрнай гісторыі Беларусі як у храналагічным плане (звычайная перыядызацыя: XVI – першая палова XVIII ст., другая палова

---

Минск, 26–27 окт. 2006 г. / НАН Беларуси, Ин-т истории ; редкол.: А. А. Коваленя (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2008. – С. 279–281.

[16] Гістарыяграфія гісторыі Беларусі: стан і перспектывы развіцця : матэрыялы навук. канф., прысвеч. 70-годдзю Ін-та гісторыі НАН Беларусі, Мінск, 6–7 кастр. 1999 г. / НАН Беларусі, Ін-т гістории ; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Дэполіс, 2000. – 345 с.

[17] Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., 28 лістап. 2003 г. : у 3 ч. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: У. В. Тугай (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2003. – 3 ч.

[18] Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / В. В. Яноўская [і інш.] ; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2020. – 684 с.

[19] Карев, Д. В. Изучение истории Беларуси в белорусской историографии 90-х годов XX – начала XXI века (основные проблемы и тенденции изучения истории феодальной Беларуси, белорусской историографии и источниковедения) / Д. В. Карев // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитар. науки. – 2012. – № 9. – С. 6–15.

XVIII – пачатак XX ст., 1861–1917 гг.), так і ў тэматычным (гісторыя да адмены прыгоннага права і пасля). Мала звяртаецца ўвагі гісторыкаў, што гэта быў менавіта пераходны перыяд, час, адзначаны значнымі трансфармацыйнымі зменамі. У гэты перыяд першаснае значэнне мелі пытанні генезісу капіталізму, нараджэння буржуазных адносін, таму вывучэнне аграрнага пытання канца XVIII – першай паловы XIX ст. мае прынцыповае значэнне.

**У другой главе «Гістарыяграфія аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – 1850-х гг. перыяду Расійскай імперыі (сярэдзіна XIX – пачатак XX ст.)»** прааналізаваны працы навукоўцаў па пытаннях сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі беларускіх зямель вызначанага часу. Для публікацый гісторыкаў другой паловы XIX ст. уласцівы краязнаўчы характар (М.В. Без-Карніловіч[20]). Апісальны метад прац без апоры на канкрэтна-гістарычныя тэорыі, за рэдкім выключэннем (В.В. Турчыновіч[21], М.В. Каяловіч[22]), не дазвалялі зрабіць паўнавартасныя высновы. Для прац гэтага перыяду характэрна схільнасць да канфесійнай і палітычнай гісторыі. Пэўныя звесткі аб сацыяльна-эканамічным развіцці беларускай вёскі змешчаны ў серыі ваенна-тапаграфічных апісанняў. Гісторыкі азначанага перыяду былі перакананы ў сваіх высновах аб цяжкім становішчы беларускіх сялян, якое негатыўна адбівалася на ўсім сацыяльна-экнамічным развіцці края. Сфарміравалася школа заходнерусізму. Усё вышэйпералічанае заклала падмурак для гісторыкаў, якія працавалі ў пачатку XX ст., калі ўпершыню праявіўся інтарэс да аграрнай гісторыі Беларусі і пачалі раскрывацца недаследаваныя з’явы і працэсы.

**Трэцяя глава «Гістарычныя даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.) савецкага перыяду»** прысвечана аналізу даследаванняў па аграрнай гісторыі Беларусі акрэсленага часу. У гэты перыяд

---

[20] Без-Корнилович, М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии, с присовокуплением и других сведений, к ней же относящихся / М. О. Без-Корнилович. – СПб. : Тип. III Отд. собст. Е. и. в. канцелярии, 1855. – VIII, 355 с.

[21] Турчинович, И. В. Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен / И. В. Турчиновича. – СПб. : Изд. В. А. Исакова, 1857. – XII, 303 с.

[22] Коялович, М. Историческое исследование о Западной России, служащее предисловием к документам, объясняющим историю западнорусского края и его отношения к России и к Польше = Études historiques sur la Russie occidentale introduction aux documents servant a éclaircir l'histoire des provinces occidentales de la Russie ainsi que leurs rapports avec la Russie et la Pologne / сост. М. Коялович. – СПб. : Тип. Э. Праца, 1865. – CCIII с.

гісторыкі звярнулі сваю ўвагу на пытанні аграрнай гісторыі Беларусі і правялі грунтоўныя даследаванні. У процівагу поглядам школы М.В. Каяловіча быў пакладзены пачатак беларускай нацыянальна-гістарычнай ідэі (М.В. Доўнар-Запольскі[23], У.М. Ігнатоўскі[24]). Афармленню нацыянальна-дэмакратычнага і нацыянальна-марксісцкага варыянтаў беларускай гістарычнай канцэпцыі[25] спрыяў метадалагічны плюралізм, уласцівы навуковаму пазнанню ў 1920-я гг. Былі закладзены асноўныя напрамкі даследавання аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. (У.І. Пічэта[26], Т.І. Забела[27]) па пытаннях распаду феадальна-прыгонніцкай сістэмы, развіцця таварна-грашовых адносін, эвалюцыі феадальнай рэнты, дыферэнцыяцыі сялянства і класавых супярэчнасцей, развіцця фальваркавай гаспадаркі. Шэраг гісторыкаў працаваў пад уплывам тэорыі гандлевага капіталу, якая з цягам часу паказала сваю памылковасць, таму не ўсе высновы навукоўцаў былі аб'ектыўнымі.

У канцы 20-х – першай палове 30-х гг. ХХ ст. савецкія гісторыкі засвоілі тэарэтычныя асновы марксізму, у тым ліку і ў даследаванні пытанняў аграрнай гісторыі, пазнаёміліся з працамі У.І. Леніна адносна праблем генезісу капіталізму ў вёсцы[28]. У айчыннай гістарыяграфіі канца 30-х – 50-х гг. ХХ ст. узнікае тэндэнцыя атаясамлівання працэсаў станаўлення капіталізму ў Беларусі нараўне з Расійскай імперыяй па тэмпах сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Спрыяльным для даследаванняў аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. можна лічыць другую палову 50-х – сярэдзіну 80-х гг. ХХ ст. Даследчая практыка праходзіла ва ўмовах барацьбы з наступствамі культу асобы і нацыяналізмам у гісторыі, крытыкі т.зв. «буржуазных фальсіфікацый»

---

[23] Довнар-Запольский, М. В. Страница из истории крепостного права в XVIII–XIX вв. / М. В. Довнар-Запольский. – М. : Изд. Т-ва И. Д. Сытина, 1906. – 67 с.

[24] Ігнатоўскі, У. Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецця : лекцыі, чыт. студэнтам Беларус. дзярж. ун-ту / У. Ігнатоўскі. – Менск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1925. – 251 с.

[25] Белозорович, В. А. Формирование и развитие концепции истории Беларуси в отечественной историографии (конце XIX – начало XXI вв.) : автореф. дис….д-ра ист. наук : 07.00.09 / Белозорович В. А.; БГУ. – Минск, 2023. – 48 с.

[26] Пичета, В. И. История сельского хозяйства и землевладения в Белоруссии : [в 2 ч.] / В. И. Пичета. – Минск : Изд. Наркомзема, 1927. – Ч. 1 : До конца XVI века. – 176 с.

[27] Забела, Т. І. Панская гаспадарка на Беларусі ў другой палавіне XVIII веку і быт падданага сялянства / Т. І. Забела. – Минск : Ін-т беларус. культуры, 1928. – 152 с.

[28] Ленин, В. И. Полное собрание сочинений : в 55 т. / В. И. Ленин. – 5-е изд. – М. : Политиздат, 1958–1983. – Т. 3 : Развитие капитализма в России. – 1979. – XVI, 791 с.

мінулага. Адмену прыгоннага права ў Беларусі даследавала М.Б. Фрыдман[29]. Даследаваннем крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы і генезісу капіталізму займаўся М.М. Улашчык[30]. Д.Л. Пахілевіч прааналізаваў розныя катэгорыі сялян Беларусі і Літвы другой паловы XVIII ст.[31]. Значнымі даследаваннямі па аграрнай гісторыі Беларусі першай паловы XIX ст. з’яўляюцца працы В.У. Чапко[32] [33]. Гісторык даследавала пытанні становішча памешчыцкіх сялян і таварнасці памешчыцкай гаспадаркі ў вызначаны перыяд.

Былі даследаваны пытанні сялянскага землекарыстння (П.Р. Казлоўскі[34], У.А. Хілюта[35], В.Ф. Голубеў[36]), становішча і павіннасці сялян (У.А. Сосна[37], П.А. Лойка[38]), сацыяльна-эканамічнае становішча вёскі і класавая барацьба

---

[29] Фридман, М. Б. Отмена крепостного права в Белоруссии / М. Б. Фридман. – Минск : Изд-во Белорус. гос. ун-та, 1958. – 200 с.

[30] Улащик, Н. Н. Сельское хозяйство Литвы и Западной Белоруссии в первой половине XIX в. (предпосылки крестьянской реформы 1861 года) : автореф. дис. … д-ра ист. наук : 07.00.02 / Н. Н. Улащик ; Акад. наук СССР, Ин-т истории. – М., 1963. – 37 с.

[31] Похилевич, Д. Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы во второй половине XVIII века / Д. Л. Похилевич. – Вильнюс : Акад. наук Литов. ССР, 1966. – 215 с.

[32] Чепко, В. В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в. / В. В. Чепко. – Минск : Наука и техника, 1966. – 218 с.

[33] Чепко, В. В. Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX в. / В. В. Чепко. – Минск : Наука и техника, 1972. – 265 с.

[34] Козловский, П. Г. Крестьянское хозяйство и положение крестьян в магнатских вотчинах Белоруссии во второй половине XVII и в XVIII вв. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / П. Г. Козловский ; Акад. наук БССР, Ин-т истории. – Минск, 1965. – 19 с.

[35] Хилюта, В. А. Землепользование и землевладение бывших помещичьих крестьян Гродненской губернии в середине XIX века (40-е – начало 70-х гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / В. М. Хилюта ; Мин. гос. пед. ин-т. – Минск, 1982. – 22 с.

[36] Голубеў, В. Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI–XVIII ст.ст. / В. Ф. Голубеў ; пад рэд. В. І. Мялешкі. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 175 с.

[37] Сосно, В. А. Формирование сословия государственных крестьян в Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX в. : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / В. А. Сосно ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1983. – 21 с.

[38] Лойка, П. А. Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі: эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI–XVIII ст. / П. А. Лойка ; пад рэд. В. І. Мялешкі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 112 с.

(М.М. Улашчык[39], А.П.Ігнаценка[40], В.І. Мялешка[41], А.М. Люты[42]). Амаль усе гісторыкі закраналі пытанні форм рэнты, дыфэрэнцыяцыі сялянства, развіцця гарадоў і прамысловасці. Нягледзячы на некаторыя супярэчлівыя погляды даследчыкаў, у сваіх высновах яны адзначалі крызіс і разлажэнне феадальна-прыгонніцкай сістэмы, якая стрымлівала фарміраванне капіталістычных адносін. Для беларускіх гісторыкаў, якія займаліся пытаннямі аграрнай гісторыі, быў характэрны перанос агульнарасійскіх характарыстык сацыяльна-эканамічных працэсаў на нацыянальную глебу і перабольшванне ўзроўню і тэмпаў развіцця буржуазных адносін.

**У чацвёртай главе «Гістарыяграфія Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг.»** праведзены аналіз сучасных даследаванняў па аграрнай праблематцы Беларусі вызначанага часу, і адлюстравана дынаміка змен у метадалагічных падыходах да вывучэння азначанай праблемы. Канец 80–90-х гг. XX ст. можна лічыць пераломным момантам у гісторыі гістарычнай навукі Беларусі. Упершыню былі зроблены спробы стварэння базісных канцэпцый гісторыі Беларусі з пазіцый нацыянальнай гістарыяграфіі і арганічнага ўключэння айчыннай гісторыі ў агульнаеўрапейскі кантэкст гістарычнага развіцця.

---

[39] Улащик, Н. Н. Сборник о крестьянском движении в Белоруссии / Н. Н.Улащик // Ист. архив. – 1960. – № 3. – С. 201–205. – Рец. на кн.: Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права (1861–1862 гг.) : док. и материалы / Акад. наук СССР, Ин-т истории [и др.] ; сост.: А. И. Азаров [и др.] ; редкол.: И. Н. Лущицкий, Е. П. Лукьянов, В. С. Давыдова. – Минск : Гос. изд-во БССР, 1959. – 481 с.

[40] Игнатенко, А. П. Борьба белорусского народа за воссоединение с Россией (вторая половина XVII – XVIII в.) : автореф. дис. … д-ра ист. наук : 07.00.02 / А. П. Игнатенко ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1976. – 42 с.

[41] Мелешко, В. И. Классовая борьба в белорусской деревне во второй половине XVII–XVIII в. / В. И. Мелешко ; науч. ред. З. Ю. Копысский. – Минск : Наука и техника, 1982. – 252 с.

[42] Лютый, А. М. Социально-экономическое развитие Белоруссии во второй половине XVIII – первой половине XIX в.: к проблеме генезиса капитализма : автореф. дис. ... д-ра ист. наук : 07.00.02 / А. М. Лютый. – Минск, 1990. – 36 с.

Пытанні сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XIX ст. даследуюць Г.М. Туміловіч[43], С.Л. Лугаўцова[44], В.С. Макарэвіч[45], У.Р. Рэут[46] і інш. Праблеме гаспадарчага развіцця ў дзяржаўных уладаннях Беларусі другой паловы XVII–XVIII ст. прысвечана даследаванне І.Ф. Кітурка[47]. Заслугоўвае ўвагі манаграфія С.М. Токця[48]. Гісторык слушна зазначыў, што ў беларускай савецкай гістарыяграфіі часы знаходжання Беларусі ў складзе Расійскай імперыі разглядаліся найперш як пераход ад феадальнага грамадства да капіталістычнага. Грунтоўнай з'яўляецца праца А.М. Лютага па праблеме сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX ст[49]. У манаграфіі на падставе архіўных матэрыялаў ахарактарызаваны сацыяльна-эканамічныя і палітычныя ўмовы зараджэння буржуазных адносін у Беларусі, адлюстравана роля таварнай вытворчасці ў перыяд позняга феадалізму, даследаваны тэндэнцыі развіцця розных форм феадальнай рэнты, эвалюцыя саслоўяў і сацыяльных груп насельніцтва Беларусі, вызначаны тэмпы генезісу капіталізму. Вывучэннем сялянскай абшчыны ў

---

[43] Тумилович, Г. Н. Дворянство Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX в. : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / Г. Н. Тумилович ; Белорус. гос. пед. ун-т. – Минск, 1995. – 19 с.

[44] Луговцова, С. Л. Политика российского самодержавия по отношению к дворянству Беларуси в конце XVIII – первой половине XIX вв. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / С. Л. Луговцова ; Белорус. гос. пед. ун-т. – Минск, 1999. – 18 с.

[45] Макарэвіч, В. С. Дробная шляхта ў 30–60-я гг. XIX ст.: склад і эвалюцыя сацыяльна-прававога становішча : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / В. С. Макарэвіч ; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2009. – 24 с.

[46] Рэут, У. Р. Урадавая палітыка па падрыхтоўцы і ўвядзенні інвентароў у памешчыцкай вёсцы Беларусі (1818–1857 гг.) : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.02 / У. Р. Рэут ; Беларус. дзярж. пед. ун-т. – Мінск, 2017. – 27 с.

[47] Кітурка, І. Ф. Сацыяльна-эканамічныя крызісы і палітыка гаспадарчага аднаўлення і развіцця ў дзяржаўных уладаннях Беларусі (другая палова XVII – XVIII ст.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / І. Ф. Кітурка ; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2002. – 20 с.

[48] Токць, С. М. Беларуская веска на мяжы эпох: змены этнічнай самасвядомасці сялянства ва ўмовах распаду традыцыйнага грамадства (па матэрыялах Гарадзеншчыны 19 – першай трэці 20 ст.) / С. М. Токць. – Гродна : Гродзен. дзярж. ун-т, 2003. – 191 с.

[49] Люты, А. М. Сацыяльна-эканамічнае развіцце Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX стагоддзя / А. М. Люты. – Минск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2004. – 320 с.

дзяржаўных, прыватнаўласніцкіх і царкоўных уладаннях Беларусі ў XVI – XVIII стст. займаецца В.Ф. Голубеў[50].

Такім чынам, у канцы XX – пачатку XXI ст. у айчыннай гістарыяграфіі наглядаўся працэс пераасэнсавання праблем крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы і генезісу капіталізму ў Беларусі ў першай палове XIX ст., зыходзячы з новых метадалагічных падыходаў.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

1. У даследаваннях аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг. вылучаны 3 перыяды.

I перыяд – гістарыяграфія Расійскай імперыі (другая палова XIX ст. – 1917 г.). Другая палова XIX ст. характарызуецца цікавасцю толькі да палітычнай гісторыі і павярхоўным аналізам сацыяльна-эканамічных адносін. Для прац гісторыкаў другой паловы XIX ст. – пачатку XX ст. уласцівы апісальны метад, этнаграфічны і краязнаўчы характар, без сур'ёзных высноў і канкрэтна-гістарычных тэорый, за выключэннем М.В. Каяловіча і В.В. Турчыновіча, якія насілі суб'ектыўна-палітычны характар. Для прац гэтага перыяду характэрна клерыкальная метадалогія аб істотнай ролі Рускай Праваслаўнай Царквы ў сацыяльна-эканамічным развіцці беларускай вёскі. Агульным для гісторыкаў канца XIX – пачатку XX ст. можна назваць абсалютнае перакананне ў цяжкім і прыгнечаным становішчы беларускіх сялян, якое негатыўна адбівалася на ўсім сацыяльна-экнамічным развіцці края.

II перыяд – гістарыяграфія савецкага перыяду (1917–1991 гг.). У межах савецкага перыяду вылучаны 5 этапаў:

1) 1920-я гг. – першыя даследаванні па аграрнай гісторыі Беларусі. Інстытуцыяналізацыя гістарычнай навукі і розныя метадалагічныя падыходы, уласцівыя навуковаму пазнанню 1920-х гг., ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі спрыялі афармленню нацыянальна-дэмакратычнага варыянту беларускай нацыянальнай гістарычнай канцэпцыі. Нягледзячы на тое, што шэраг гісторыкаў працаваў пад уплывам тэорыі гандлёвага капіталу, якая з цягам часу паказала сваю памылковасць, былі закладзены асноўныя напрамкі даследавання аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг.

[50] Голубеў, В. Ф. Сялянская абшчына ў дзяржаўных, прыватнаўласніцкіх і царкоўных уладаннях Беларусі ў XVI–XVIII стст. : аўтарэф. дыс. … д-ра гіст. навук : 07.00.02 / В. Ф. Голубеў ; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2010. – 50 с.

(У.І. Пічэта, М.В. Доўнар-Запольскі, У.М. Ігнатоўскі, Т.І. Забела). У пачатку XX ст. аграрная гісторыя Беларусі пачынае фарміравацца як самастойны кірунак дасдедаванняў, са сваім прадметам і крынічнай базай. Яе далейшае развіццё вызначалася не толькі ўключэннем у навуковы ўжытак новых крыніц, але і павышэннем тэарэтычнага ўзроўню вывучэння аграрнай праблематыкі, ўкараненнем новай метадалогіі. Адбывалася ідэйная барацьба паміж прадстаўнікамі дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі і гісторыкамі-марксістамі;

2) 1930-я – сярэдзіна 1950-х гг. – станаўленне і развіццё марксісцка-ленінскай канцэпцыі гістарычнага працэсу ў спалучэнні з рэпрэсіўнай палітыкай Савецкай дзяржавы у дачыненні да апанентаў. Падрыхтоўка метадычных матэрыялаў і праграм для падрыхотоўкі кадраў, якія заклалі асновы марксісцка-ленінскай метадалогіі аб працэсах даследавання капіталізму. Выйшаў шэраг прац В.К. Шчарбакова і Д.А. Дудкова, напісаных на аснове марксісцка-ленінскай метадалогіі, якія фактычна сталі ўзорам новага падыходу да вывучэння гісторыі. У пасляваенныя гады роля навукі ўзрасла яшчэ больш, працягвалася яе інстытуялізацыя;

3) сярэдзіна 1950-х – сярэдзіна 1960-х гг. – адыход гісторыкаў ад сталінскага вульгарызму. Даследчая практыка праходзіла ва ўмовах барацьбы з наступствамі культу асобы ў гісторыі. Адмену прыгоннага права і яе передумовы даследавала М.Б. Фрыдман. Аграрная рэформа 1861 г. прызнавалася пачаткам капіталістычнай фармацыі. Вывучэннем працэсаў, якія адбываліся ў сацыяльна-эканамічным развіцці беларускай вёскі ў перыяд крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы і генезісу капіталізму займаўся М.М. Улашчык. Гісторыю сялянства і сацыяльныя адносіны ў беларускай вёсцы даследаваў Д.Л. Пахілевіч, які з асцярожнасцю адносіў да прыкметаў зараджэння капіталістычных адносін такія фактары, як наёмная праца, маёмасная дыферэнцыяцыя сялян і рост грашовай рэнты;

4) сярэдзіна 1960-х – сярэдзіна 1980-х гг. – найбольш насычаны этап вывучэння аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг. у айчыннай гістарыяграфіі. Гэта тлумачыцца тым, што тэма сацыяльна-эканамічных адносін была другой па значнасці ў савецкі час пасля пытанняў гісторыі рэвалюцыі і класавай барацьбы. Былі даследаваны пытанні сялянскага землекарыстання (П.Р. Казлоўскі, У.А. Хілюта), становішча і павіннасці сялян (Д.У. Пахілевіч, У.А. Сосна), сацыяльна-эканамічнае становішча вёскі і класавая барацьба (В.У. Чапко, М.М. Улашчык В.І. Мялешка, А.П. Ігнаценка, П.А. Лойка). Амаль усе гісторыкі ў сваіх працах закраналі пытанні форм рэнты, дыфэрэнцыяцыі сялянства, развіцця гарадоў і

прамысловасці. Нягледзячы на некаторыя супярэчлівыя погляды даследчыкаў, у сваіх выснових усе гісторыкі адзінагалосна адзначалі крызіс і разлажэнне феадальна-прыгонніцкай сістэмы, якая стрымлівала фарміраванне капіталістычных адносін. Некаторыя гісторыкі з мэтай сацыяльна-эканамічнага абгрунтавання неабходнасці рэвалюцыі 1917 г. суб'ектыўна перабольшвалі тэмпы развіцця генезісу капіталізму ў вёсцы (В.У. Чапко, М.М. Улашчык, В.П. Панюціч і інш.). У пацверджанне сваіх высноў навукоўцы прыводзілі тэзісы аб развіцці таварнай вытворчасці ў памешчыцкіх маёнтках, павелічэнні прадпрымальніцтва, пераходзе сялянскай гаспадаркі дзяржаўных маёнткаў да дробнатаварнай вытворчасці, узамцненні маёмаснай дыферэнцыяцыі сялян. Вызначаныя працэсы былі значана перабольшаны. Наглядалася уніфікацыя канцэпцыі гісторыі Беларусі і Расійскай імперыі;

5) сярэдзіна 1980-х гг. – 1991 г. – першыя спробы пераасэнсавання гістарычнага мінулага на аснове новых метадалагічных падыходаў. В.Ф. Голубеў адзначаў, што другая палова XVIII ст. была часам узнаўлення і далейшага развіцця сельскай гаспадаркі на аснове ўмацавання фальварачна-баршчыннай сістэмы. Такія ж высновы зрабіў і П.А. Лойка. А.М. Люты дасканала прааналізаваў праблему генезісу капіталізму на беларускіх землях у канцы XVIII – першай палове XIX ст. і, у адрозненне ад асноўнай масы савецкіх гісторыкаў, вызначыў, што ў даследуемы час фарміраваліся спрыяльныя ўмовы для развіцця буржуазных адносін.

III перыяд – гістарыяграфія ў Рэспубліцы Беларусь і Расійскай Федэрацыі (1992 г. – пачатак XXI ст.) На працягу 90-х гг. мінулага стагоддзя захоўваўся інтарэс гісторыкаў да аграрнай гісторыі Беларусі эпохі феадалізму. Падводзіліся вынікі і завяршаліся даследаванні папярэдняй эпохі. Знакавай працай можна назваць трохтомную «Гісторыю сялянства Беларусі». Адначасова выходзілі працы, якія яшчэ па-ранейшаму былі напісаны на аснове марксіцка-ленінскай метадалогіі (В.П. Панюціч, П.Ц. Петрыкаў), так і выданні на падставе новых падыходаў (А.П. Жытко, В.Ф. Голубеў, С.М. Токць). Першыя перабольшвалі тэмпы генезісу капіталізму ў аграрным сектары эканомікі, падмянялі працэсы маёмаснай дыферэнцыяцыі сацыяльнай. Другія свярджалі, што ў даследуемы перыяд толькі зараджаліся перадумовы для новых буржуазных адносін (А.П. Жытко), а сельская гаспадарка развівалася на аснове далейшага ўмацавання фальварачна-баршчыннай сістэмы. Двухтысячныя гады характарызуюцца з'яўленнем большай колькасці даследванняў па гістарыяграфіі сацыяльна-эканамічнай гісторыі. Даследчыкі аналізуюць гістарычныя працэсы з улікам новых метадалагічных напрамкаў: мікрагісторыя і паўсядзённая гісторыя,

гендэрны і сацыяльны аспект антрапалагічных пошукаў, трансфармацыйныя працэсы грамадскага жыцця, якія ліквідуюць абязлічаннасць гісторыі нашай краіны і вызначаюць новыя адметныя асабліваці беларускай зямлі [2; 3; 4; 5; 6; 11].

2. Навукоўцы другой паловы XIX – пачатку XX ст. зрабілі значны ўклад у даследаванне палітычнай гісторыі беларускіх зямель, вызначэнне асаблівасцей Беларусі ў грамадскім развіцці. Аднак сціплыя характарыстыкі гісторыкаў сацыяльна-эканамічнага становішча аграрнай гісторыі беларускіх зямель не дазвалялі ім зрабіць паўнавартасныя высновы. Перыяд 60-х гг. XIX – пачатак XX ст. – час, калі беларускія землі ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі, праводзілася мэтанакіраваная палітыка інтэграцыі края ў склад расійскай дзяржавы. Адсюль характэрныя антыпольскія канцэпцыі і прарасійскія погляды, інтарэс да палітычнай і юрыдычнай гісторыі. Некаторыя даследчыкі вызначалі Беларусь у якасці самастойнай дзяржавы (І.В. Турчыновіч і А.К. Кіркор), але большасць навукоўцаў не прызнавала такую гістарычную канцэпцыю развіцця беларускіх зямель (М.В. Каяловіч, П.М. Жуковіч). Сфарміравалася школа заходнерусізму. Для прац гісторыкаў другой паловы XIX ст. – пачатку XX ст. уласцівы апісальны метад, этнаграфічны і краязнаўчы характар, без сур'ёзных высноў і канкрэтна-гістарычных тэорый, за рэдкім выключэннем (М.В. Каяловіч, В.В. Турчыновіч), якія насілі суб'ектыўна-палітычны характар. Для прац гэтага перыяду характэрна клерыкальная метадалогія аб істотнай ролі Рускай Праваслаўнай Царквы ў сацыяльна-эканамічным развіцці беларускай вёскі. Агульным для гісторыкаў канца XIX і пачатку XX ст. можна назваць абсалютнае перакананне ў цяжкім і прыгнечаным становішчы беларускіх сялян, якое негатыўна адбівалася на ўсім сацыяльна-экнамічным развіцці. У пачатку XX ст. упершыню праявіўся інтарэс да аграрнай гісторыі Беларусі і пачалі раскрывацца недаследаваныя працэсы. У процівагу заходнерусізму з'явіліся публікацыі, якія паклалі пачатак заснаванню беларускай нацыянальна-гістарычнай ідэі [2; 8; 9; 12; 13].

3. Устаноўлена, што сітуацыя становча мяняецца ў пачатку 20-х гг. XX ст. У гэты перыяд былі праведзены значныя даследаванні і сабраны багаты факталагічны матэрыял. Інстытуцыяналізацыя гістарычнай навукі і метадалагічны плюралізм, уласцівы навуковаму пазнанню ў 1920-я гг., ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі спрыялі афармленню нацыянальна-дэмакратычнага і нацыянальна-марксісцкага варыянтаў беларускай нацыянальнай гістарычнай канцэпцыі. Нягледзячы на тое, што шэраг гісторыкаў працаваў пад уплывам тэорыі гандлевага капіталу, якая з цягам часу паказала сваю памылковасць, былі закладзены асноўныя напрамкі даследавання аграрнай

гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. (М.В. Доўнар-Запольскі, Т.І. Забела, У.І. Пічэта). Гэта тычылася пытанняў распаду феадальна-прыгонніцкай сістэмы, развіцця таварна-грашовых адносін, эвалюцыі феадальнай рэнты, дыферэнцыяцыі сялянства, развіцця фальваркавай гаспадаркі, аналізу першапачатковых форм назапашвання капіталу і класавых супярэчнасцей. Навукоўцамі былі вызначаны кірункі для далейшага вывучэння аграрнай гісторыі Беларусі. У 30–80-я гг. XX ст. у гістарычнай навуцы Беларусі ўсталявалася марксісцка-ленінская метадалогія. Для гісторыкаў, якія займаліся пытаннямі аграрнай гісторыі, быў характэрны перанос агульнарасійскіх характарыстык сацыяльна-эканамічных працэсаў на нацыянальную глебу і перабольшванне ўзроўню і тэмпаў развіцця буржуазных адносін. Самы працяглы перыяд вывучэння аграрнай гісторыі Беларусі вызначанага часу ў айчыннай гістарыяграфіі прыпадае на 60–80-я гг. мінулага стагоддзя. Гэта тлумачыцца тым, што тэма сацыяльна-эканамічных адносін была другой па значнасці ў савецкі час пасля пытанняў гісторыі рэвалюцыі і класавай барацьбы. Усе праанлізаваныя працы, як і патрабаваў таго час, метадалагічна абапіраліся на марксісцка-ленінскую тэорыю. Былі даследаваны пытанні сялянскага землекарыстння (П.Р. Казлоўскі, У.А. Хілюта, В.Ф. Голубеў), становішча і павіннасці сялян (Дз.У. Пахілевіч, У.А. Сосна, П.А. Лойка), сацыяльна-эканамічнае становішча вёскі і класавая барацьба (В.У. Чапко, М.М. Улашчык В.І. Мялешка, А.П. Ігнаценка, А.М. Люты). Нягледзячы на некаторыя супярэчлівыя погляды даследчыкаў, у сваіх высновах гісторыкі адзінагалосна адзначалі крызіс і разлажэнне феадальна-прыгонніцкай сістэмы, якая стрымлівала фарміраванне капіталістычных адносін. Працы савецкага перыяду адрозніваліся ад даследаванняў перыяду Расійскай імперыі шматаспектнасцю, больш глыбокім фcraталагічным матэрыялам і ўвядзеннем у навуковы ўжытак архіўных крыніц. Нягледзячы на суб’ектывізм высноў некаторых даследаванняў, быў закладзены падмурак для далейшых дыскусій па праблемах сацыяльна-прававых і эканамічных умоў генезісу капіталізму. Даследаванні савецкага часу на сённяшні дзень з’яўляюцца важнымі крыніцамі навуковай інфармацыі [3; 6; 7; 10; 11; 14].

4. З пачатку 90-х гг. тэарэтычны плюралізм дазволіў спецыялістам вывучаць гістарычны працэс з пункту гледжання розных метадалагічных падыходаў, пазбавіўшыся старых догмаў – партыйнасці і класавых пазіцый, таму даследаванні ў галіне аграрнай гісторыі Беларусі знайшлі свой лагічны працяг. Можна сцвярджаць, што гэты перыяд – супярэчлівы ў айчыннай гістарыяграфіі. На працягу 90-х гг. мінулага стагоддзя захоўваўся інтарэс гісторыкаў да аграрнай гісторыі Беларусі перыяду феадалізму. Падводзіліся вынікі і завяршаліся

даследаванні папярэдняй эпохі. Знакавымі сталі публікацыі Я.К. Анішчанкі, А.М. Лютага, В.Ф. Голубева, трохтомнай «Гісторыі сялянства Беларусі». Адначасова выходзілі працы, якія па-ранейшаму былі напісаны на аснове марксіцка-ленінскай метадалогіі (В.П. Панюціч, П.Ц. Петрыкаў), так і выданні на падставе новых падыходаў (В.Ф. Голубеў, А.П. Жытко, С.М. Токць і інш.). Двухтысячныя гады характарызуюцца з'яўленнем большай колькасці даследванняў па сацыяльна-эканамічнай гісторыі. Пазітыўнай з'явай у айчыннай і расійскай гістарычнай навуцы стала тое, што даследчыкі аналізуюць гістарычныя працэсы з улікам новых гістарыяграфічных напрамкаў: тэорыі мадэрнізацыі, мікрагісторыі і гісторыі паўсядзённасці, гендэрнага і сацыяльнага аспектаў антрапалагічных пошукаў, якія дазваляюць ачалавечыць гісторыю і вызначыць новыя адметныя асаблівасці гістарычнага развіцця Беларусі. Навукоўцы адыходзяць ад палітызавансці высноў сваіх даследаванняў. Як адзначаюць сучасныя даследчыкі, гісторыя феадалізму – гэта, перш за ўсё, гісторыя ніжэйшых слаёў грамадства, і іх вывучэнне для савецкіх гісторыкаў мела першаступеннае значэнне. На сучасным этапе развіцця гістарычнай навукі пачынаюць даследавацца і іншыя саслоўныя групы насельніцтва. Сацыяльная гісторыя паступова вылучылася ў якасці самастойнага напрамку ў гістарычнай навуцы. Аграрная гісторыя, якая сфарміравалася ў якасці асобнага кірунка ў гістарыяграфіі ў пачатку XX ст., павінна стаць самастойным прадметам даследавання [5; 6; 15; 16].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Дысертацыя з'яўляецца ўкладам у распрацоўку праблематыкі аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. Вывады і асноўныя палажэнні дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры напісанні абагульняючых прац і падручнікаў, пры распрацоўцы агульных і спецыяльных курсаў па гістарыяграфіі гісторыі Беларусі, а таксама эканамічнай гісторыі Беларусі. Атрыманыя аўтарам вынікі даследавання маюць значны практычны патэнцыял і могуць быць запатрабаваны органамі дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА

*Артыкулы ў навуковых часопісах і зборніках навуковых прац, уключаных Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў:*


1. Тукайла, Н. К. (Сямашка Н. К.) Даследаванні айчынных гісторыкаў гістарыяграфіі аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. / Н. К. Тукайла // Весці Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2012. – № 2 (72). – С. 13–15.

2. Тукайла, Н. К. (Сямашка Н. К.) Гістарыяграфія канца XIX – пачатку XX ст. аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII першай паловы XIX ст. / Н. К. Тукайла // Весці Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2013. – № 2 (76). – С. 40–43.

3. Тукайла, Н. К. (Сямашка Н. К.) Беларуская савецкая гістарыяграфія аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII першай паловы XIX ст. / Н. К. Тукайла // Весці Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2013. – № 4 (78). – С. 22–26.

4. Тукайла, Н. К. (Сямашка Н. К.) Постсавецкая айчынная гістарыяграфія аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII першай паловы XIX ст. / Н. К. Тукайла // Весці Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2014. – № 2 (80). – С. 45–49.

5. Сямашка, Н. К. Сучасная беларуская гістарыяграфія аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. / Н. К. Сямашка // Беларуская думка. – 2024. – № 4. – С. 86–92.

6. Сямашка, Н. К. Аграрная гісторыя Беларусі як самастойны кірунак у айчыннай гістарыяграфіі (1920-х гг. – пачатку XXI ст.) / Н. К. Сямашка // Веснік Брэсцкага ўн-та. Сер. 2, Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2024. – № 1. – С. 52–59.


**Артыкулы ў навуковых зборніках і матэрыялы навуковых канферэнцый.**

*Артыкулы ў зборніках навуковых прац:*


7. Тукайло, Н. К. (Сямашка Н. К.) Советская историография 20 – 30-х гг. XX ст. о проблемах аграрной истории Беларуси конца XVIII – первой половины XIX вв. / Н. К. Тукайло // Актуальные пытанні гістарыяграфіі айчыннай і сусветнай гісторыі : зб. навук. прац / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка; рэдкал.

М. М. Забаўскі, Г. А. Космач, А. М. Люты [і інш.]; навук. рэд. А. П. Жытко. – Мінск : БДПУ, 2012. – С. 85–87.

8. Тукайло, Н. К. (Сямашка Н. К.) Историография 60–90-х гг. XIX в. аграрной истории Беларуси конца XVIII – первой половины XIX в. / Н. К. Тукайло // Актуальные вопросы современной науки : сб. науч. раб. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка; редкол. : В.В. Бущик (отв. ред.), Д. И. Наумов, А. Ф. Ратько. – Минск : БГПУ, 2012. – С.41–44.

9. Тукайло, Н. К. (Сямашка Н. К.) Досоветская историография аграрной истории Беларуси конца XVIII – первой половины XIX в. / Н. К. Тукайло // Образование и наука в Беларуси: актуальные проблемы и перспективы развития в XXI веке : сб. науч. ст. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; редкол. : В.В. Бущик (отв. ред.), Д. И. Наумов, А. А. Корзюк [и др.]. – Минск : БГПУ, 2012. – С. 181–184.

10. Тукайло, Н. К. (Сямашка Н. К) Советская историография 60-х – 80-х гг. XX в. аграрной истории Беларуси конца XVIII – первой половины XIX в. / Н. К. Тукайло // Актуальныя праблемы айчыннай і сусветнай гісторыі : зб. навук. прац / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка ; рэдкал. : М. М. Забаўскі, А. П. Жытко, Г. А. Космач [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2013. – С. 41–45.

11. Тукайло, Н. К. (Сямашка Н. К) Периодизация советской историографии аграрной истории Беларуси конца XVIII – первой половины XIX в. / Н. К. Тукайло // Образование и наука в Беларуси : актуальные проблемы и перспективы развития в XXI веке : сб. науч. ст. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; ред. кол. : В. В. Бущик (отв. ред.), Д. И. Наумов, А .А. Корзюк [и др.]. – Минск : БГПУ, 2013. – С. 183–189.

12. Тукайла, Н. К. (Сямашка Н. К) Уплыў М. В. Каяловіча на беларускую гістарыяграфію пачатку XX ст. / Н. К. Тукайла // Беларусь у пачатку XX ст. : Да 100-годдзя БДПУ : зб. навук. арт. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка; рэдкал.: А. І. Андарала, М. М. Забаўскі, А. М. Люты [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2014. – С. 73–76.

13. Тукайла, Н. К. (Сямашка Н. К.) Погляды М. В. Без-Карніловіча на аграрную гісторыю Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. / Н. К. Тукайла // Актуальныя пытанні сучаснай навукі : зб. навук. прац / рэдкал.: В. В. Бушчык (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2014. – С. 52–56.

*Артыкулы ў зборніках матэрыялаў канферэнцый:*

14. Тукайло, Н. К. (Сямашка Н. К.) Историография 80-х гг. XX в. – начала XXI в. аграрной истории Беларуси конца XVIII – первой половины XIX ст. / Н. К. Тукайло // Европа: актуальные проблемы этнокультуры : материалы IV Междунар. науч.-теорет. конф., г. Минск, 22 апр. 2013 г. / Бел. гос. пед. ун-т им.

М. Танка ; редкол. : В. В. Тугай (отв. ред.), А. П. Житко, Г. А. Космач [и др.]. – Минск : БГПУ, 2013. С. 300–302.

15. Тукайло, Н. К. (Сямашка Н. К.) Отечественная историография 90-х гг. XX в. аграрной истории Беларуси конца XVIII – первой половины XIX в. / Н. К. Тукайло // Европа: актуальные проблемы этнокультуры : материалы VII Междунар. науч.-теорет. конф., г. Минск, 21 янв. 2013 г. / Бел. гос. пед. ун-т М. Танка ; редкол. : В. В. Тугай (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГПУ, 2014. – С. 224–226.

16. Сямашка, Н. К. Сучасныя падыходы да вывучэння аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII – першай паловы XIX ст. у працах айчынных гісторыкаў / Н. К. Сямашка // Подзвігу народа жыць у вяках (да 70-годдзя Вялікай Перамогі) : матэрыялы Рэсп. навук-тэарэт. канф., г. Мінск, 28 крас. 2015 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка; рэдкал, А. В. Касовіч, А. П. Жытко (навук. рэд.). – Мінск : БДПУ, 2015. – С. 168–170.

# РЭЗЮМЭ

## Сямашка Надзея Канстанцінаўна

## Беларускія і расійскія даследаванні аграрнай гісторыі Беларусі (канец XVIII ст. – 1850-я гг.)

**Ключавыя словы:** гістарыяграфія, гістарычныя даследаванні, аграрная гісторыя, генезіс капіталізму, разлажэнне феадалізму, феадальна-прыгонніцкая сістэма, канцэпцыя, Беларусь.

**Мэта даследавання:** выяўленне ўласцівых расійскай, савецкай гістарыяграфіі, навейшым даследаванням у Рэспубліцы Беларусь і Расійскай Федэрацыі метадаў, падыходаў, тэндэнцый, агульнага і асаблівага для распрацоўкі гістарыяграфічнай канцэпцыі аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг.

**Метады даследавання**: для дасягнення пастаўленай мэты выкарастаны агульна-навуковыя (аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя, узыходжанне ад канкрэтнага да абстрактнага і інш.) і канкрэтна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны) метады.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна:** упершыню ў беларускай гістарычнай навуцы выяўлены канцэптуальныя падыходы, тэндэнцыі і асаблівасці ў вывучэнні аграрнай гісторыі Беларусі канца XVIII ст. – 1850-х гг., уласцівыя гістарыяграфіі Расійскай імперыі і савецкага перыяду, навуковым публікацыям у Рэспубліцы Беларусь і Расійскай Федэрацыі, што дазволіла сфармуляваць канцэпцыю даследавання, выявіць праблемы, якія патрабуюць далейшай навуковай распрацоўкі.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні вынікаў дысертацыі**: высновы і асноўныя палажэнні дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры напісанні абагульняючых прац, метадычных дапаможнікаў і падручнікаў, пры распрацоўцы агульных і спецыяльных курсаў па гістарыяграфіі гісторыі Беларусі, а таксама эканамічнай гісторыі Беларусі. Атрыманыя аўтарам вынікі даследавання маюць значны практычны патэнцыял і могуць быць запатрабаваны органамі дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь.

**Галіна выкарыстання:** гістарыяграфія гісторыя Беларусі, сацыяльная гісторыя, эканамічная гісторыя.

## РЕЗЮМЕ
## Семашко Надежда Константиновна

**Белорусские и российские исследования аграрной истории Беларуси (конец XVIII в. – 1850-е гг.)**

**Ключевые слова:** историография, исторические исследования, аграрная история, генезис капитализма, разложение феодализма, феодально-крепостнический строй, концепция, Беларусь.

**Цель исследования:** выявление характерных российской, советской историографии, новейшим исследованиям в Республике Беларусь и Российской Федерации методов, подходов, тенденций, общего и особенного для разработки историографической концепции аграрной истории Беларуси конца XVIII в. – 1850-х гг.

**Методы исследования:** для достижения поставленной цели использованы общенаучные (анализ и синтез, индукция и дедукция, восхождение от конкретного к абстрактному и др.) и конкретно-исторические (историко-генетический, историко-сравнительный, историко-типологический и историко-системный) методы.

**Полученные результаты и их новизна:** впервые в белорусской исторической науке выявлены концептуальные подходы, тенденции и особенности в изучении аграрной истории Беларуси конца XVIII в. – 1850-х гг., характерные для историографии Российской империи и советского периода, научным публикациям в Республике Беларусь и Российской Федерации, что позволило сформулировать концепцию исследования и выявить проблемы, требующие дальнейшей научной разработки.

**Рекомендации по использованию результатов диссертации:** выводы и основные положения диссертации могут быть использованы при написании обобщающих работ, методических пособий и учебников, при разработке общих и специальных курсов по историографии истории Беларуси, а также экономической истории Беларуси. Полученные автором результаты исследования имеют значительный практический потенциал и могут быть востребованы органами государственного управления Республики Беларусь.

**Область использования:** историография истории Беларуси, социальная история, экономическая история.

## SUMMARY
**Siamashka Nadzeya**

**Belarusian and russian studies of the agrarian history of Belarus (late 18th cent. – 1850s)**

**Keywords**: historiography, historical research, agrarian history, genesis of capitalism, decline of feudalism, feudal-serfdom system, concept, Belarus.

**The aim of the research**: to identify methods, approaches, trends, common and specific features of Russian, Soviet historiography, the latest research in the Republic of Belarus and the Russian Federation in the development of a historiographic concept of the agrarian history of Belarus in the late 18th cent. – 1850s.

**The methods of the research**: to achieve the stated goal, general scientific (analysis and synthesis, induction and deduction, ascent from the concrete to the abstract, etc.) and specific historical (historical-genetic, historical-comparative, historical-typological and historical-systemic) methods are used.

**The results and their novelty**: for the first time in Belarusian historical science, conceptual approaches, trends and features in the study of the agrarian history of Belarus of the late 18th century – 1850s which are characteristic of the historiography of the Russian Empire and the Soviet period, scientific publications in the Republic of Belarus and the Russian Federation are identified, which makes it possible to formulate the concept of the study and identify problems requiring further scientific development.

**Recommendations for the use of the dissertation**: the conclusions and main provisions of the dissertation can be used in writing general educational works and textbooks, in developing general and special courses on the historiography of the history of Belarus, as well as the economic history of Belarus. The research results obtained by the author have significant practical potential and can be relevant for the government bodies of the Republic of Belarus.

**Field of use**: historiography history of Belarus, social history, economic history.